# ТРЭБА ШЫРЭЙ ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ ФЕРМЕРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У нас трэць ці чвэрць гаспадарак, з якімі вы, дзяржаўныя ўласнікі, не спраўляецеся. Ну дык трэба шырэй выкарыстоўваць фермераў. Але гэта не павінна быць бяздумна. У дзяржавы заўсёды павінна быць жорсткая падушка бяспекі, — заявіў Прэзідэнт. — У нас ёсць добрыя фермеры, якія сябе зарэкамендавалі. Хочуць — аддайце лепш ім. І не спяшайцеся аддаваць замежнікам. А калі аддаяце, то жалезабетонна — пад умовы. Сяло у нас выходзіць на нармальны ўзровень развіцця. Нельга страціць кіраванне ў сельскай гаспадарцы».

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што з прыватнікам часам нават прасцей працаваць, чым з дзяржаўным кіраўніком. «Але трэба бачыць эфектыўнасць, харчовую бяспеку дзяржавы. Хіба прыватнікі выцягнулі б сяло 10 гадоў таму, калі мы стварылі праграму?» — адзначыў беларускі лідар.

Ацэньваючы дасягнутыя ў фермерскай гаспадарцы вынікі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў выключную важнасць наяўнасці граматнага кіраўніка, які можа належным чынам арганізаваць працоўны працэс. Прэзідэнт у сувязі з гэтым патрабуе больш актыўна выкарыстоўваць вопыт такіх людзей для падрыхтоўкі перспектыўных кіруючых кадраў. «Калі няма кіраўніка — ніколі не будзе гаспадаркі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Ёсць нармальныя людзі, і ім трэба аддаваць зямлю. Няхай працуюць».

«Трэба падумаць аб нейкім холдынгу, некалькіх гаспадарках. Думаю, адсюль ужо 2-3 чалавекі кіраўнікоў знойдзецца. Калі гатовы паўтарыць у іншых гаспадарках, тое, што маецца, — скажы», — адзначыў Прэзідэнт, звяртаючыся да кіраўніка фермерскай гаспадаркі Уладзіміра Адамовіча.

«Не трэба гэтага баяцца. Ён можа ўзяць тры-чатыры, можа, пяць гаспадарак. Нават у розных галінах. Калі ў яго ёсць жаданне і грошы. Галоўнае, каб былі такія кіраўнікі, якія ведаюць і мінулае, і сучаснасць», — упэўнены беларускі лідар.

Асаблівы акцэнт кіраўнік дзяржавы зрабіў на неабходнасці падтрымкі мясцовага насельніцтва з боку кіраўніцтва сельгаспрадпрыемстваў, незалежна ад формы ўласнасці. У перспектыве дзяржава будзе падтрымліваць як прыватнікаў, так і дзяржаўнікаў выключна зыходзячы з гэтага фактару. «Бізнес бізнесам. Працуйце. Не будзем перашкаджаць, дашліфуем заканадаўства. Але вы іх павінны бачыць, гэта вашы людзі. Тады мы будзем вас падтрымліваць. Мы ў гэтым плане возьмем потым ухіл. Зараз мы падтрымліваем нават вытворчасць, каб вы ўсталі на ногі, — сказаў Прэзідэнт. — А потым мы, дзяржава, будзем займацца сацыяльнымі пытаннямі, пытаннямі інфраструктуры, а вы — вытворчасцю. Але вас будзем падтрымліваць за тое, што вы па-чалавечы ставіцеся да людзей, якія жывуць у вёсках на вашай тэрыторыі».

Прэзідэнту далажылі аб рэалізацыі інвестпраекта па пашырэнні сельгасвытворчасці і інвесціраванню ў развіццё ААТ «Косіна». У 2015 годзе са згоды кіраўніка дзяржавы акцыі ААТ «Косіна» былі бязвыплатна перададзены з уласнасці Лагойскага раёна ва ўласнасць КФГ «Цнянскія экапрадукты», заключаны адпаведны інвестыцыйны дагавор. Усе дамоўленасці паспяхова выконваюцца, гаспадарка ўстойліва працуе, развіваецца, ствараюцца новыя працоўныя месцы.

Аляксандр Лукашэнка таксама азнаёміўся з арганізацыяй захоўвання, перапрацоўкі агароднiны, бульбы і падрыхтоўкі камбікармоў, выставай прадукцыі, што выпрацоўваецца на прадпрыемстве, і сучаснай тэхнікі, якая выкарыстоўваецца ў гаспадарцы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў нарасціць тэмпы ўборачнай. «Час выходзіць на намалот пад 500 тысяч тон у дзень. Каб за два — два з паловай дні мы мільён малацілі», — сказаў Прэзідэнт.

«Ужо пайшла масавая ўборка. На сённяшні дзень убрана больш за 30% збажыны. Намалочана 2 млн 330 тыс. т, — далажыў віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы. — За ўчарашні дзень намалацілі прыкладна 340 тысяч тон».

Падчас рабочай паездкі таксама абмяркоўваліся закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю, вытворчасць асобных відаў сельскагаспадарчых культур, нарыхтоўка кармоў, выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы па развіцці вытворчасцей цукру і шэраг іншых пытанняў у сферы эфектыўнага гаспадарання на зямлі.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, нагадаў аб патрабаванні больш актыўна выкарыстоўваць арганічныя ўгнаенні. «Не разлічвайце, што мы будзем купляць за валюту ўгнаенні. Трэба ўносіць больш арганікі», — адзначыў Прэзідэнт.

■ Выбары-2016

# ВАЖНАЯ НЕ АПАЗІЦЫЙНАСЦЬ, ВАЖНЫ АЎТАРЫТЭТ

## Участковыя камісіі сфарміраваны, завяршаецца працэс вылучэння кандыдатаў

**27 ліпеня завяршыўся працэс утварэння ўчастковых выбарчых камісій, у іх увайшло 65 857 прадстаўнікоў розных палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў, грамадзян, працоўных калектываў. Пры гэтым 71,2% з ліку членаў камісій — жанчыны, прадстаўнікоў палітычных партый у камісіях 5,2%.**

### Ацэньвалі асобу ў цэлым

**Лідзія ЯРМОШЫНА** на прэс-канферэнцыі ў пятніцу паведаміла, што пры ўключэнні кандыдатур у склад камісій ацэньвалася характарыстыка асобы ў цэлым: палітычныя і маральныя якасці, месца чалавека ў грамадстве, сацыяльны аўтарытэт.

— Чаму ў дачыненні да тых ці іншых прадстаўнікоў апазіцыйных партый прымаюцца рашэнні, якія не задавальняюць іх? — задалася пытаннем старшыня Цэнтрвыбаркама. — Гэта ўсё залежыць ад людзей, якія ўваходзяць у тыя ці іншыя партыі. Часцей за ўсё задавальняюцца заяўкі беларускай партыі левых «Справядлівы свет», таму што гэта, як правіла, людзі, якія даўно і добра «ўманціраваны» ў грамадства і карыстаюцца аўтарытэтам. Калі чалавек не працуе, калі ён не валодае нейкай станоўчай характарыстыкай у рэгіёне, то ўсё гэта разглядаецца не з улікам яго апазіцыйнасці, а з улікам асобы, яго асобасных характарыстык.

### Назіральнікі едуць

— Як заўсёды ў нашай краіне выбары праходзяць галосна і пры шырокім назіранні, — канстатавала старшыня Цэнтрвыбаркама. — У Цэнтральнай камісіі акрэдытавана 8 прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў у якасці нацыянальных назіральнікаў. Прычым пяцёра з гэтых васьмі прадстаўляюць беларускія апазіцыйныя партыі і рухі. Сёння апошні пратакол, які я бачыла і падпісала, — гэта пратакол вылучэння прадстаўніка беларускай партыі левых «Справядлівы свет». Акрамя гэтага, у Цэнтральнай камісіі акрэдытавана 193 міжнародныя назіральнікі.

Акрэдытавана 142 назіральнікі ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў і 51 назіральнік ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (БДІПЧ АБСЕ). Місія БДІПЧ АБСЕ, дарэчы, прыязджае ў краіну 31 ліпеня, гэта значыць ужо ў гэтую нядзелю, і на 2 жніўня ў Цэнтральнай камісіі прызначана сустрэча з кіраўніцтвам місіі.



Фота БЕЛТА.

### Конкурс будзе расці

Старшыня ЦВК нагадала, што 1 жніўня — апошні дзень здачы дакументаў аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты.

— Па стане на 28 ліпеня вылучана 263 кандыдаты. Калі казаць пра конкурс, то ў сярэднім па краіне ён складае зараз больш за 2 чалавекі на месца. З вылучаных кандыдатаў 70 чалавек —жанчыны. Грамадзян ва ўзросце да 30 гадоў, гэта значыць моладзі — 28 чалавек. 16 чалавек з'яўляюцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў цяперашняга склікання, дэпутатаў мясцовых саветаў сярод вылучаных 31.

Кіраўнік ЦВК выказала меркаванне, што ў бліжэйшыя дні будзе паступаць вялікая колькасць дакументаў аб вылучэнні, паколькі набліжаецца крайні тэрмін іх падачы.

***

**Вольга КЛІМЯНКОВА, старшыня акруговай выбарчай камісіі Магілёўскай — Цэнтральнай выбарчай акругі №85, удзельнічае ў выбарчых кампаніях не першы год.**

— Назіраецца вялікая актыўнасць парламенцкай кампаніі, — кажа яна. — У нашай акрузе зарэгістравана 7 ініцыятыўных груп. Іншымі словамі, на 1 месца можа прэтэндаваць 7 кандыдатаў. З іх 5 беспартыйныя і 2 члены партыі. На 28 ліпеня ў камісіі паступілі дакументы на вылучэнне трох кандыдатаў: двух ад працоўных калектываў і аднаго ад беларускай партыі левых «Справядлівы свет». Але да 1 жніўня яшчэ ёсць час вылучыцца ў кандыдаты. Мы прымаем дакументы да разгляду да 19 гадзін.

Столькі ж ініцыятыўных груп зарэгістравана ў Магілёўскай — Кастрычніцкай акрузе №86. Акрамя гэтага на разглядзе ў камісіі знаходзяцца дакументы яшчэ на дзвюх асоб, якія збіраюцца балатавацца ў якасці кандыдатаў ад палітычных партый — Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці і БНФ.

Агульная колькасць выбаршчыкаў як па 85-й выбарчай акрузе, так і па 86-й складае прыкладна 66 тысяч. На тэрыторыі выбарчай акругі № 85 створана 39 участковых камісій. У акруговай камісіі зарэгістравана 6 назіральнікаў з Магілёва, і яе ўжо наведалі 2 міжнародныя.

Сёлета будучым кандыдатам у дэпутаты прадстаўлены вялікі выбар месцаў для правядзення агітацыі, за выключэннем найбольш стратэгічных пляцовак. Яны пералічваюцца на сайтах рай- і гарвыканкамаў. Зараз паўсюдна вядзецца збор подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў.

**Старшыня акруговай выбарчай камісіі Горацкай выбарчай акругі №82 Леанід ЯГОРАНКА** паведаміў, што на 28 ліпеня на тэрыторыі акругі адбылося 12 пікетаў. Неабходную колькасць галасоў пажадалі сабраць 5 чалавек.

— Усе пікеты праводзіліся ў адпаведнасці з заканадаўствам, ніякіх парушэнняў выяўлена не было, — паведаміў Леанід Ягоранка.

Ён таксама нагадаў, што ў Горках забаронена збіраць подпісы ў раёне аўта- і чыгуначнага вакзалаў, паліклінікі і цэнтральнай плошчы перад райвыканкамам.

У Магілёве падлік пікетаў не вядзецца, але члены акруговых камісій могуць у любы момант праверыць, ці ёсць там нейкія парушэнні.

— Асабіста бачыў пікеты каля гандлёвых цэнтраў «Прэстан», «Е-Сіці», на вуліцы Астроўскага — было цікава падысці, паглядзець, як яны працуюць, — кажа **старшыня акруговай выбарчай камісіі Магілёўскай — Кастрычніцкай акругі №86 Аляксандр КАЖАМЯКІН.** — Асобы, якія знаходзіліся на пікетах, мелі пры сабе дакументы, якія пацвярджаюць, што яны сапраўды з'яўляюцца членамі ініцыятыўных груп.

—Мы, як і любыя выбаршчыкі, цікавімся, падыходзім — дадае Вольга Клімянкова. — Агітацыя за канкрэтных кандыдатаў пачнецца пасля рэгістрацыі, пакуль прэтэндэнты на ўдзел у выбарах маюць магчымасць паведамляць толькі свае біяграфічныя звесткі. Выбаршчык можа падпісацца за ўсіх прэтэндэнтаў, каб у тых была магчымасць вылучыцца, а вось голас аддасць толькі за аднаго.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*
**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Моладзь без межаў

# Дыялог Бе-La-Русаў

**Днямі ў лагеры «Бе-La-Русь», што ўжо 25-ы раз працуе на мяжы Беларусі, Латвіі і Расіі, прайшлі дэбаты ў фармаце «Адкрытага дыялогу».**

Лідары Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, маладзёжных арганізацый суседніх краін абмеркавалі тэму «Моладзь і палітыка». Сярод іншага закраналіся пытанні палітычнай актыўнасці маладога пакалення, найбольш запатрабаванай моладдзю ідэалогіі, недапушчэння росту папулярнасці радыкальных і экстрэмісцкіх груп і рухаў, прадстаўлення інтарэсаў маладых у органах улады, у тым ліку парламенце, праблема «бацькоў і дзяцей» у палітыцы і многія іншыя.

Як адзначаюць арганізатары, тэмы, пытанні, праблемы і прапановы, агучаныя падчас адкрытага дыялогу, могуць сфарміраваць новы вектар міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва як з боку грамадскіх фарміраванняў, так і органаў дзяржаўнай улады, прыдаць новы імпульс у рабоце з моладдзю.

Праект БРСМ «Адкрыты дыялог» стартаваў як дыскусійная пляцоўка, якая дае маладым магчымасць уздымаць самыя вострыя праблемы і задаваць хвалюючыя пытанні прадстаўнікам органаў улады, палітыкам, прадпрымальнікам, грамадскім дзеячам. З цягам часу праект набыў маштаб сапраўднага грамадскага руху. Дэбаты праходзілі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і сталі формай прамога кантакту ўлады і грамадзян, інструментам развіцця грамадзянскай супольнасці ў краіне.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.